## *Верасень*

### 5 верасня – 125 гадоў з дня нараджэння В. Ф. Вольскага (1901–1988), пісьменніка, драматурга, тэатральнага крытыка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі

Віталь Фрыдрыхавіч Вольскі – аўтар краязнаўчых кніг і цікавых нарысаў, драматызаваных казак і тэатральных п'ес, даследчык беларускай літаратуры і фальклору, перакладчык і крытык – у сваіх творах адлюстраваў прыгажосць беларускай прыроды, раскрыў яе глыбокую сувязь з чалавекам.

Нарадзіўся В. Вольскі (сапраўднае прозвішча Зэйдэль) у Санкт-Пецярбургу ў сям'і служачага. Пасля заканчэння сямі класаў гімназіі працаваў на Трубачным заводзе, потым канторшчыкам у Камісарыяце гарадской гаспадаркі Петраграда (1918–1919). Служыў у Чырвонай арміі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне. З 1919 па 1926 г. знаходзіўся ў пагранічных войсках і органах ВЧК. Пасля дэмабілізацыі працаваў старшым інспектарам Галоўнага рэпертуарнага камітэта БССР. У 1927 г. В. Вольскі скончыў Камуністычны ўніверсітэт Беларусі імя У. І. Леніна. З 1928 па 1932 г. быў старшым інструктарам кінафікацыі Белдзяржкіно, некаторы час – дырэктарам Віцебскага мастацкага тэхнікума, потым дырэктарам Беларускага дзяржаўнага тэатра ў Віцебску. З 1932 па 1936 г. В. Вольскі ўзначальваў Інстытут літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР, адначасова з'яўляўся рэдактарам часопіса «Мастацтва і рэвалюцыя». У 1934 г. стаў кандыдатам філалагічных навук. У гэтым жа годзе быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны В. Вольскі знаходзіўся ў Маскве. Па заданні Саўінфармбюро працаваў для замежнай прэсы, з 1942 г. загадваў літаратурна-мастацкім аддзелам сатырычнай газеты-плаката ЦК Кампартыі Беларусі «Раздавім фашысцкую гадзіну», з канца 1943 г. – аддзелам часопіса «Беларусь». З 1948 па 1954 г. з'яўляўся старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР, у 1953–1966 гг. узначальваў праўленне Літфонду БССР.

Упершыню ў друку В. Вольскі выступіў у 1926 г. з артыкуламі пра тэатральнае мастацтва, фальклор і мову. Яму належаць навукова-даследчыя і літаратуразнаўчыя працы «Праблемы беларускай савецкай драматургіі» (1934), «Эдуард Самуйлёнак: жыццё і творчасць» (1951), «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізму» (1958) і інш. Вучоны з'яўляецца адным з аўтараў дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» (1956), падручніка «Беларуская савецкая літаратура» для 9–10 класаў (1948–1954) і інш. Ён даследаваў народную творчасць і старажытныя кнігі татар (кітабы), напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. Добрае веданне народнай творчасці дапамагло В. Вольскаму стварыць новы жанр у беларускай літаратуры – драматызаваную казку. Па першай яго п'есе «Цудоўная дудка» (напісана ў 1938 г.) быў пастаўлены ў 1939 г. спектакль у Тэатры юнага гледача БССР, які прывабліваў гледачоў сакавітай мовай персанажаў, народным гумарам, казачнымі прыёмамі, прымаўкамі, прыказкамі.



У 1939 г. у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек адбылася прэм'ера спектакля «Чароўныя падарункі» па п'есе В. Вольскага «Дзед і Жораў». У гэтай казцы аўтар стварыў шэраг фантастычных вобразаў, якія выхоўвалі веру ў справядлівасць і дабрыню. Найбольш папулярнай п'есай пісьменніка стала камедыя «Несцерка» (1940). У 1941 г. упершыню пастаўлена на сцэне Другога беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-2) у Віцебску. Галоўнага героя Несцерку, які ўвасабляў лепшыя рысы народа (вынаходлівасць, мудрасць, шчырасць, гумар і энергію) з выключным майстэрствам апраналі знакамітыя беларускія акцёры А. Ільінскі, Ф. Шмакаў, Я. Шыпіла і інш. У 1946 г. спектакль удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР. У 1955 г. па гэтым творы быў зняты аднайменны фільм. На аснове беларускага народнага падання пра асілка-волата В. Вольскі напісаў драму «Машэка» (1946), спектакль па якой быў пастаўлены ў 1954 г. у БДТ-2. Плённа працаваў пісьменнік і ў прозе. Вынікам яго шматлікіх паездак па Беларусі і творчых камандзіровак сталі нарысы і апавяданні , змешчаныя ў кнігах «Па лясных сцежках» (1948), «У лясах над Бярозай» (1955), «Месяц за месяцам» (1956), «На бабровых азёрах» (1957), «Чайкі над Нарaччу» (1959), «Палессе» (1971, 1974). Многія творы з іх аб'яднаны ў зборніку «Родны край» (1961) і «Лёс Дункана» (1978). Тонкі знаўца прыроды і паслядоўны яе абаронца, В. Вольскі ў празаічных творах апісвае запаветныя куткі Беларусі – Белавежскую пушчу, Бярэзінскі запаведнік, раку Нёман, возера Нарач, расказвае пра жывёльны і раслінны свет Палесся. Пісьменніка цікавіць і гісторыя Беларусі, якой прысвечаны кнігі «Старонкі нашай гісторыі» (1966) і «Три путешествия в страну белорусов» (1967), «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968). Пісьменнік наведваў і краіны Афрыкі – Сенегал, Бераг Слановай Косці, Гвінею, Туніс, Марока, якім прысвяціў кнігу «Афрыканскае падарожжа» (1963) і нарысы «Эль Махрыб» (1965). Навукова-мастацкія кнігі В. Вольскага каштоўныя не толькі пазнавальным матэрыялам. У іх уздымаюцца такія актуальныя праблемы, як чалавек і прырода, ахова прыроды, гаспадарчае выкарыстанне прыродных багаццяў і інш. Пісьменнік вядомы і як таленавіты перакладчык. На беларускую мову ён пераклаў сатырычную паэму «Рэйнеке-Ліс» І. В. Гётэ, раманы «Выпрабаванне» В. Брэдэля і «Зельманцы» М. Кульбака.

У 1971 г. В. Вольскаму было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР. Ён узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» (1955, 1964), Чырвонай Зоркі, медалямі.

### *Творы В. Ф. Вольскага*

**Выбраныя** творы : у 2 т. / Віталь Вольскі ; [прадмова Я. Герцовіча]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. – 2 т.

**Падарожжа** па краіне беларусаў : [нарысы] / Віталь Вольскі ; мастак М. Пракаповіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. – 317, [1] с. : іл.

**Несцерка** : п'еса : для сярэдняга школьнага ўзросту / Віталь Вольскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – 77, [1] с. : партр. – (Бібліятэка школьніка).

### *Аб жыцці і творчасці пісьменніка*

**Вольскі Віталь Фрыдрыхавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 269.

**Вольскі Віталь Фрыдрыхавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 389.

**Вольскі Віталь Фрыдрыхавіч** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агульнай рэдакцыяй А. В. Сабалеўскага. – Мінск, 2002. – Т. 1. – С. 223.

**Вольскі Віталь Фрыдрыхавіч** // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : [у 2 т.]. – Мінск, 2005. – Т. 1. – С. 272–273.

**Вольскі Віталь Фрыдрыхавіч** // Янка Купала : энцыклапедыя : [у 3 т.] – Мінск, 2017. – Т. 1.– С. 192.

**Вольскі Віталь** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса. – Мінск, 1993. – Т. 2. – С. 44–50.

**Віталь Вольскі** // Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / складальнік А. К. Гардзіцкі. – Мінск, 1994. – С. 108–109.

**Рагаўцоў, В. І.** Віталь Вольскі / Васіль Рагаўцоў // Вербальныя сродкі камічнага ў беларускай драматургіі: 1920–1940-я гады / Васіль Рагаўцоў. – Гродна, 2015. – С. 194–203.